ВОЛЬГА ЛЕТА: ШЛЯХ АД КАРАЛЕВЫ ТВЭРКА ДА БІЗНЕС-ЛЭДЗІ

Вольга Лета. Тварам, энергетыкай гродзенка нагадвае Мэрлін Манро. Як і амерыканка-легенда, Вольга такая ж нязломная, энергічная, з неўтаймавальнай прагай жыцця і, канешне, харызмы ў ёй больш, чым дазволена законам. У Гродне яе любяць ці крытыкуюць — раўнадушных няма. Так, радніць Вольгу з артысткай і атрыманае асуджэнне: кагосьці абураюць відэа твэрка (не самага высокага віду танцаў), нехта скептычна ставіцца да яе спеваў з Мікалаем Баскавым у Крамлі і да заробкаў у сеткавым бізнесе.
Аднак відэа каралевы твэрка набіраюць мільённыя прагляды, Вольга плануе сольную кар'еру спявачкі, а бізнес як квітнеў, так і квітнее.
Па-за кадрам застаецца іншая Вольга Лета: добры да людзей чалавек, працавіты прафесіянал, клапатлівая мама са сваёй філасофіяй любові і шчасця.



Не гарачымі танцамі адзінымі

Імя набрала абароты, Вольга змагла дазволіць сабе любую свабоду, узяць чамадан і без лішніх акалічнасцяў ляцець, куды душа просіць. На любое мора. Але так было не заўсёды...

Першыя гурткі па танцах яшчэ юная Вольга Лета (прозвішча, дарэчы, сапраўднае) вяла бясплатна, не цуралася выступіць у дзіцячым садку ці на правінцыйным фэсце. Не прыберагаючы сябе для пафасных праектаў, яна атрымлівала каштоўны вопыт у родным горадзе. Ужо тады харэограф вылучалася шырынёй поглядаў, зоркай таленту. «Каралева дэнсхола Беларусі — 2013» і «Каралева твэрка Беларусі — 2016». Але сапраўдную сілу Вольга адчула, калі адкрыла ўласную школу танцаў. У чым жа сакрэт папулярнасці яе студыі?

«Сказаць, што ўсё залежыць ад кірунку? Не, няпраўда. Гадоў дзесяць таму з маёй групай «Імпульс» было тое ж самае, а там правакацыйнага твэрка і блізка не існавала. З пяці чалавек — у 300 за нейкі год! І калі ў Растоў-на-Доне пераехала, таксама дзяўчаты, якія хацелі навучыцца дэнсхолу, жаночаму танцу, выбіралі мяне. А Растоў велізарны горад, і канкурэнцыя там драконаўская. У танцах галоўнае шалёная энергетыка без пантоў», — усміхаецца Вольга.

Гродзенка адна з першых у Беларусі асвоіла твэрк. З кліпаў замежных рэпераў гэты гарачы танцавальны стыль прыйшоў і да нас, выклікаў неадназначную рэакцыю, але прыжыўся. Вольга Лета лічыць твэрк вясёлай заменай трэнажоркі, кросфіту і пілатэсу. Самай старой з вучаніц на яе памяці было гадоў 40. І кожная жанчына адкрывае сябе новую, упэўненую і больш прывабную.

Відэа Вольгі з украінскага праекта «Танцуюць усе» набрала на YouTube — увага! — 30 мільёнаў праглядаў. І гэта яно зацікавіла маскоўскіх прадзюсараў. Беларусцы прапанавалі месца ў групе «Queens». А далей — супольныя песні з Мікалаем Баскавым і выступленні на «Залатым грамафоне».

Формула поспеху

«А сумнеў, што патрапіце ў даўгавую яму, быў, калі пазычалі вялікую суму на адкрыццё школы? Страх рызыкі?» — цікаўлюся.

«Сумнеў? — перапытвае Вольга. — Які сумнеў? Я ж упэўнена: усё атрымаецца. Тут няма рызыкі. Рызыка гэта... ну, не ведаю, можа, скочыць са скалы з парашутам *(смяецца)*, калі гадаеш: выжывеш ці не? А такія звычайныя рэчы, як грошы пазычыць, крэдыт узяць, прафесію змяніць, ІП адкрыць, пераехаць *(з усмешкай адмахваецца)*...»

«Чалавек, які мае здаровыя рукі, ногі, галаву не можа патануць у цяжкіх часах, як у балоце. Ва ўсіх адкалькавая колькасць гадзін у сутках. Я лічу, калі хочаш зарабіць, пойдзеш, заробіш. Усё! — разводзіць рукамі Вольга. — Я, напрыклад, магу быць настаўніцай фізкультуры, бо маю адпаведную адукацыю, магу — швачкай. У любым выпадку, калі нешта здарыцца, танцаваць не змагу, я заўжды знайду сабе цёплае месца. Таму страху аніякага не маю. Цяжка псіхалагічна? Так, быў у мяне такі перыяд, але яго ніхто не заўважыў. Знаходзячыся ў стане адчаю, я магу абсалютна якасна працаваць, здымацца ў кліпах, фатаграфавацца, ездзіць на конкурсы, шыць сцэнічныя касцюмы, займацца здароўем і знешнасцю і проста ўсміхацца на фоне ўнутранага канфлікту, не бачнага ні для каго, апрача мяне. Не можа быць такога, што я пачала перажываць, захуталася ў коўдру і стала важыць 100 кілаграмаў. Я не я, калі спынюся! Шчасце — гэта не толькі тады, калі ты на грэбені хвалі. Шчасце — гэта і бура, і тупіковая гавань, проста твой лад жыцця!»

«З кім вы сябе атаясамліваеце?» — пытаю.

«Многія гады мне падабаўся фільм «Пяты элемент», мне здавалася, што нешта падобнае з гераіняй ёсць. А можа, мне хацелася быць іншапланецянкай і мець фантастычныя здольнасці, як усёмагутная Міла Ёвавіч *(смяецца)*. Знаёмыя кажуць, што падобная да Мэрлін Манро. Але гэта чыста знешняе, бо біяграфія абсалютна іншая», — кажа гродзенка.

Біяграфія Вольгі Лета багатая на падзеі: першая ў Беларусі анлайн-школа танцаў, уласны блог, канал на You Tube, «Праграма схуднення з Вольгай Лета», ранішняя зарадка на ТБ і бясплатная зарадка ў парку Жылібера, псіхалагічныя трэнінгі ад Вольгі Лета. А сама яна то найлепшая на акцёрскіх курсах, то самая старанная на вакале. Ладзіць харэаграфію і танцавальныя лагеры ў Індыю, Тайланд, дае майстар-класы па дэнсхоле, актыўна працуе ў сеткавым бізнесе і ўдала прадае самую розную прадукцыю.

«Памятаеце басню пра Мурашку і Стракозу? Вам знаёмы вечны канфлікт тэхнароў і людзей творчых? «Лета чырвонае праспявала, ідзі цяпер галодная ў маразы і патанцуй»?

«Выбраць асноўным заробкам творчасць — гэта рызыка. Колькі танцораў? І колькі з іх ядуць марцыпаны? Таму творчых людзей я вельмі люблю! Па меншай меры адзін раз яны праявілі мужнасць. Толькі смелы скажа: «Я хачу спяваць!» «Якое спяваць? Эканамістам ідзі!» — кінуць у твар. З дрэнным стаўленнем ад тэхнароў я не сутыкалася. Пытанне не ў фізіках і лірыках, а ў людзях, якія ў душы недалюбліваюць сваю працу. Вечарам яны кажуць: «Я стаміўся, серыял пагляджу. Усё». Вось з такімі людзьмі ў мяне канкрэтнае *(павышае голас)* узаемнае непаразуменне! Аматары наседжаных месцаў, а я люблю мяняцца, ехаць у іншы горад і пачынаць з нуля. Ёсць творчыя інжынеры, урачы, а настаўнік — гэта мегатворчасць, залатая прафесія. Я ведаю, што кажу. Мая мама настаўніца», — усміхаецца гераіня.

Вольга Лета заўжды глядзела шырока: першая ў горадзе занялася самарэкламай, першая раздзяліла заняткі па кірунках (хіп-хоп, танцы на абцасах, расцяжка — усё асобна). Стала Праметэем, які не мае патрэбы ў натхненні звонку, бо сама сабе матыватар, зарадка для іншых. Яна падтрымала дзясятак вучняў у трэнерстве. Нават Масква сустрэла гродзенку надзіва цёпла: Вольга сама выбірала студыю на правах гаспадыні ўласнага лёсу.

Бізнес-лэдзі ўпэўнена, што дасягнуць вышынь можна і ў Беларусі: «Імя зробіш дзе заўгодна. Выбірай краіну, едзь і працуй. Так, у Маскве больш конкурсаў, кастынгаў. Але з іншага боку — больш шанцаў згубіцца. Лепш быць першай у Мілане, чым другой у Рыме. У маленькім горадзе з чымсьці прасцей, але можаш вылезці, а цябе хутка апусцяць рэаліі нашага жыцця *(смяецца)*. Ворагам народа аб'яваць, калі аўдыторыю з суседняй школы пераманіш. Люблю наш час інтэрнэту! Адпраўляй рэзюмэ, здымай відэа — і крутая работа гарантавана. Проста беларусы часта сумняваюцца, недаацэньваюць сябе, а насамрэч наш народ вельмі моцны».

Пра любоў і каханне

«Я не афішую асабістае жыццё ў сацсетках, таму камусьці здаецца, што ў мяне ўжо шэсць кошак пры адсутнасці спатканняў. Гэта не так», — загадкава ўсміхаецца гераіня.

«А мама вы якая?» — цікаўлюся.

«Зусім непатрабавальная. Я хачу, каб мая дачка мела асалоду ад жыцця. Вельмі шмат усіх, хто патрабуе і будзе патрабаваць. Няхай я буду тым сябрам, да якога яна заўжды можа прыйсці, ведаючы, што мне ад яе нічога не трэба. Я проста яе люблю. Два ці дзесяць атрымае — усё роўна. Вядома, парадуюся, калі дзесяць», — адказвае Вольга.

«Уявіце сваё жыццё праз 10 гадоў. Дзе вы і што вас акаляе?» — пытаю.

«Так, дачцэ маёй ужо за 20 *(паўза)*. Яна вучыцца ва ўніверсітэце. Самастойная, уся ў мяне, — смяецца Вольга і працягвае: — Па-любому за гэты час я ўжо паспею сустрэць каханне. Я з маім мужчынам. І гэта першы твар, які побач. Мы падарожнічаем. Разам старэем ва ўтульным доме з вокнамі на шчасце. З водарам смачнай ежы. Не піражкоў, канешне, бо гэта планы на 10, а не 30 гадоў *(смяецца)*. Мая справа квітнее. Студыя танцаў, а можа і аздараўленчы цэнтр. Канешне, там у мяне ўжо ёсць другое дзіця, а можа і трэцяе *(усміхаецца)*».

А пакуль сэрца Вольгі Лета застаецца вольным.

Маргарыта САДОЎСКАЯ.

Передняя:

Пераднавагодняе

У маёнтак да Дзеда Мароза

Святочны цягнік, які складаецца з купэйных вагонаў, будзе дастаўляць турыстаў у госці да Дзеда Мароза ў Нацыянальны парк «Белавежская пушча» 23 і 28 снежня і 2, 4, 6, 11 студзеня, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.

Цягнік будзе адпраўляцца са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 21.50 і прыбываць у Брэст раніцай наступнага дня ў 7.40, адкуль турыстаў даставяць у Белавежскую пушчу на камфартабельных аўтобусах. Там госці правядуць цэлы дзень. Падарожнікаў чакае насычаная навагодняя экскурсійная праграма: яны наведаюць маёнтак беларускага Дзеда Мароза, убачаць домік Снягуркі, музей падарункаў «Скарбніца», чароўны калодзеж і ветраны млын, змогуць загадаць жаданне на Паляне казак і атрымаць навагодні падарунак ад самога Дзеда Мароза. У праграму тура таксама ўваходзіць знаёмства з музеем прыроды, шпацыр уздоўж вальераў з жывёламі і пачастунак блінамі з гарбатай на пушчанскіх травах. Назад у сталіцу з Брэста навагодні цягнік адправіцца ў 17.50 і прыбудзе ў Мінск у 22.15, у дарозе пасажыраў чакаюць конкурсы ад аніматараў.

У бягучым навагоднім сезоне турыстычны цэнтр «Дартур» Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі плануе арганізаваць восем навагодніх цягнікоў.

Акрамя гэтага 22 снежня Дзіцячая чыгунка імя К. С. Заслонава адкрывае праект «Навагодні экспрэс». Святочны цягнік будзе курсіраваць у дні зімовых канікул, калядных і навагодніх свят з 22 снежня да 7 студзеня. Першы ў гэтым сезоне цягнік, якім будуць кіраваць юныя чыгуначнікі, адправіцца з перона станцыі Заслонава сёння ў 11.00.

Дзіцячая чыгунка запрашае мінчан і гасцей сталіцы здзейсніць незабыўнае падарожжа па снежаньскім лесе. На станцыі «Сасновы Бор» будзе арганізавана тэатралізаванае прадстаўленне, падрыхтаванае Мінскім Палацам культуры і спорту чыгуначнікаў. Дзеці сустрэнуцца з казачнымі героямі, Дзедам Марозам і Снягуркай, прымуць удзел у навагодніх конкурсах і гульнях.

Білеты на «Навагодні экспрэс» ужо ў продажы. Іх можна набыць на станцыі Заслонава Дзіцячай чыгункі. Кошт складае 17 рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сканворд



Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, г. Мінск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Парус. Зорыч. Ікра. Апломб. Даміно. Трава. Абоз. Сумка. Юшка. Атака. Пілі. Лотас. Куб. Крона. Агіда. Кат. **Па вертыкалі:** Паром. Схіл. Корм. Дзед. Чан. Кораб. Абраз. Пот. Рагу. Воўк. Сажалка. Малаток. Адрасат. Шапка. Алібі. Топ. Кана. Луг.

Даты Падзеі Людзі

22 СНЕЖНЯ

У краіне

1918 год — у Мінску на аснове Першага таварыства беларускай драмы і камедыі пад кіраўніцтвам Ф. Ждановіча і тэатральнага калектыву пад кіраўніцтвам Ф. Аляхновіча ўтвораны Беларускі савецкі тэатр. У складзе тэатра быў хор У. Тэраўскага і аркестр пад кіраўніцтвам Ф. Тхожа. Рэжысёры: Аляхновіч і Ждановіч. Калектыў праводзіў культурна-асветную работу. У рэпертуары пераважна былі беларускія творы: «Раскіданае гняздо» і «Паўлінка» Я. Купалы, п'есы У. Галубка, Ф. Аляхновіча, А. Чэхава, «Модны шляхцюк» К. Каганца, «Кветка папараці» К. Буйло, інсцэніроўкі па творах Э. Ажэшкі «Хам» і «Рысь» і інш. Пры тэатры працавала літаратурная секцыя. Дзейнічаў да сакавіка 1919 года.

1923 год — нарадзілася (в. Ушалы Шумілінскага раёна) Ефрасіння Савельеўна Зянькова, Герой Савецкага Саюза. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў маладзёжнага падполля ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Пасля акупацыі Віцебшчыны ў роднай вёсцы наладзіла сувязь з партызанскім атрадам імя Варашылава, выконвала яго заданні, вяла разведку. У пачатку 1942 года ўзначаліла Обальскае камсамольска-маладзёжнае падполле. Падпольшчыкі здзейснілі 21 дыверсію: вывелі са строю электрастанцыю і чыгуначную вадакачку, спалілі льнозавод, машыннае аддзяленне цаглянага завода, узарвалі тры торфапрадпрыемствы, знішчылі некалькі мастоў, аўтамашын, эшалон са снарадамі і інш. З верасня 1943 года ў партызанах. У пасляваенныя гады была на камсамольскай рабоце. Памерла ў 1984 годзе.

1945 год — у Мінску адкрыты Беларускі тэатральны інстытут (сёння — Беларуская акадэмія мастацтваў).

1958 год — апублікаваны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні Беларускай ССР ордэнам Леніна за паспяховае аднаўленне народнай гаспадаркі і вялікія дасягненні беларускага народа ў далейшым развіцці прамысловасці, будаўніцтва, сельскай гаспадаркі і культуры.

2000 год — у Мінску здадзены ў эксплуатацыю новы будынак Цэнтральнага чыгуначнага вакзала.

У свеце

1858 год — нарадзіўся Джакама Пучыні, вялікі італьянскі кампазітар. Аўтар опер «Манон Леско», «Тоска», «Багема», «Мадам Батэрфляй» і інш. Памёр у 1924 годзе.

1920 год — адбыўся VIII Усерасійскі з'езд Саветаў, на якім быў прыняты Дзяржаўны план электрыфікацыі Расіі (ГОЭЛРО). Прыняцце плана ГОЭЛРО, які распрацоўвала Дзяржаўная камісія па электрыфікацыі краіны, створаная за год да гэтага, і стала пачаткам электрыфікацыі Савецкай Расіі. План ГОЭЛРО быў разлічаны на 10—15 гадоў і прадугледжваў карэнную рэканструкцыю народнай гаспадаркі на базе электрыфікацыі. У асноўным ён быў ажыццёўлены да 1931 года.



1937 год — нарадзіўся Эдуард Успенскі, савецкі і расійскі пісьменнік. Аўтар аповесцяў і апавяданняў для дзяцей, у тым ліку «Кракадзіл Гена і яго сябры», «Уніз па чароўнай рацэ», «Трое з Прастаквашына», п'ес, у тым ліку «Чабурашка і яго сябры». Арганізатар выдавецтва дзіцячай развівальнай літаратуры «Самавар», аўтар папулярнай праграмы «У нашу гавань заходзілі караблі».

Наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 26 снежня 2018 года.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.27	16.49	7.22
Віцебск —	9.24	16.31	7.07
Магілёў —	9.17	16.39	7.22
Гомель —	9.05	16.45	7.40
Гродна —	9.40	17.06	7.26
Брэст —	9.32	17.16	7.44

Месяц

Поўня ў 20.49.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Ганны, Ефрасінні, Аляксандра, Васіля, Сцяпана, Уладзіміра.*
К. *Ганараты, Зянона, Францішка.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Выкладчыца філасофіі павялічыла грудзі...
Ну, і наведвальнасць падцягнула.

— У п'яным выглядзе, грамадзянін, мы вас у тэатр не пусцім!
— А вунь таго пусцілі!
— Дык гэта артыст, яму выступаць...

Вартаўнік склада біжутэрыі жыве вельмі бедна, але затое вельмі прыгожа.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4534.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 21 снежня 2018 года.